Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
________ А. В. Данільчанка
(подпіс) (ініцыялы, прозвішча)
27.07.20__
(дата зацвярджэння)
Рэгістрацыйны № УД-1126/вуч.

**Метадалогія літаратуразнаўчых даследаванняў**

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па дысцыпліне для спецыяльнасці:**

**1-21 80 10 Літаратуразнаўства**

2015 г.

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
_______________ А. В. Данільчанка
(подпіс) (ініцыялы, прозвішча)
____________________
(дата зацвярджэння)
Рэгістрацыйны № УД-______/вуч.

**Метадалогія літаратуразнаўчых даследаванняў**

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па дысцыпліне для спецыяльнасці:**

**1-21 80 10 Літаратуразнаўства**

2015 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта II ступені вышэйшай адукацыі (магістратуры) “Литературоведение. ОСВО 1-21 80 10-2012” і тыпавога вучэбнага плана па спецыяльнасці вышэйшай адукацыі другой ступені (магістратуры) “1-21 80 10 Литературоведение. 2012”.

**СКЛАДАЛЬНІК:**

Л.Д. Сінькова, прафесар кафедры беларускай літаратуры і культуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар філалагічных навук, прафесар.

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

Г.К. Тычко, прафесар кафедры медыялогіі і вэб-журналістыкі Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар філалагічных навук, прафесар.

М.В. Трус, загадчык кафедры беларускай філалогіі Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта, кандыдат філалагічных навук, дацэнт.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭНННЯ:**

Кафедрай беларускай літаратуры і культуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (пратакол № 9 ад 21.05.2015 г.).

# Тлумачальная запіска

Літаратуразнаўства з'яўляецца адной з базавых дысцыплін у галіне гуманітарных ведаў, якія актуалізуюцца на аснове дасканалай метадалогіі, выпрацаванай стагоддзямі функцыянавання мастацкіх тэкстаў у соцыуме. Сучаснаму выпускніку вышэйшай школы з такімі адукацыйнымі ступенямі, як магістратура і аспірантура, належыць упэўнена валодаць метадалогіяй літаратуразнаўчых даследаванняў. Названая метадалогія – гэта ключ да культурнага кантынууму, адэкватнай арыентацыі ў сучасным, перанасычаным інфармацыйнымі патокамі свеце, перадумова паспяховасці ў навуковых даследаваннях маладых вучоных-філолагаў.

**Актуальнасць дысцыпліны.** Патрабаванні БелВАК да падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі засяроджваюць увагу на абнаўленні метадалагічных распрацовак у галіне гуманітарных навук. Праз вывучэнне метадалогіі літаратуразнаўства магістранты і аспіранты набываюць навукова-карэктны светапогляд, адрэфлексоўваюць дынаміку межаў філасофіі, сацыялогіі, мастацтва і ўласна літаратуразнаўства. Бакалаўры, якія паступаюць у магістратуру і аспірантуру, арыентуюцца на аператыўную падрыхтоўку кваліфікацыйных навуковых прац (дысертацыйных даследаванняў).

**Мэта дысцыпліны** – вывучэнне метадалогіі літаратуразнаўства XX-XXI стст. у Беларусі і за яе межамі: сістэмны аналіз эстэтычных школ і кірункаў, аўтарытэтных у сусветнай навуцы, а таксама вывучэнне спадчыны найбольш значных літаратуразнаўцаў – заснавальнікаў і прадаўжальнікаў традыцый найслынных школ (з найбольш запатрабаваных у славянскім кантэксце, напрыклад, А. Весялоўскі, М. Бахцін, А. Лосеў, Ю. Лотман, Д. Ліхачоў, Я. Карскі, М. Гарэцкі, І. Замоцін, А. Бабарэка, А. Адамовіч, С. Александровіч, У. Конан, В. Каваленка, І. Навуменка, А. Лойка і інш.).

Асноўная мэта курса – вывучэнне базавых, традыцыйных літаратуразнаўчых ідэй і канцэпцый, а таксама іх сучаснага прачытання ў эпоху сінхроннага функцыянавання розных метадалагічных парадыгм, з выпрацоўкай навыкаў аналізу тэкстаў.

**Задачы вывучэння дысцыпліны**:

**А.** Забяспечыць засваенне магістрантамі канцэптуальных ведаў пра:

- прынцыпы мадэлявання рэальнасці ў мастацтве;
- прыроду і формы мастацкай умоўнасці ў літаратуры і мастацтве;
- асноўныя літаратурна-мастацкія парадыгмы;
- асноўныя навуковыя школы і напрамкі ў літаратуразнаўстве.

**Б.** Выпрацаваць у магістрантаў наступныя ўменні:

- інтэрпрэтаваць мастацкі тэкст у актуальным культуралагічным кантэксце;
- паслядоўна вытрымліваць неабходныя патрабаванні да аналізу мастацкага тэксту;
- даследаваць тэкст у адпаведнасці з канкрэтнымі методыкамі, што існуюць у літаратуразнаўстве;

- суадносіць мастацкія творы з пэўнымі стылёвымі напрамкамі ў літаратуры і мастацтве.

Міжпрадметныя сувязі. Для паспяховага засваення курса неабходныя веды па дысцыплінах: “Уводзіны ў літаратуразнаўства”, “Тэорыя літаратуры”, “Гісторыя беларускай літаратуры”, “Гісторыя беларускай літаратурнай крытыкі”, “Гісторыя рускай літаратуры”, “Гісторыя замежнай літаратуры”, “Гісторыя Беларусі”, “Філасофія”, “Культуралогія”, “Эстэтыка”.

Агульная колькасць гадзін – 108; аўдыторных гадзін – 34, з іх: лекцыі – 18, семінарскія заняткі – 8, практычныя заняткі – 2; кіруемая самастойная работа студэнтаў (КСР) – 6. Форма справаздачнасці – экзамен у ІІ семестры.

## Змест вучэбнага матэрыялу

**Тэма 1. Праблемы літаратуразнаўчай метадалогіі ў сучаснай навуцы.**

Паняцце навуковага метаду. Метадалогія як асобная навуковая галіна. Сувязь даследчых метадаў з філасофскай пазіцыяй даследчыка. Школа і кірунак у літаратуразнаўстве. Пошук метадаў, адэкватных аб’екту даследавання. Праблема метадалагічнай эклектыкі. Дынаміка метадалагічных парадыгм, канвенцыйнасць у тэрміналагічных сістэмах.

**Тема 2. Міфалагічная школа.** Рамантычнае разуменне мастацтва: філасофска-эстэтычныя ідэі Ф. Шэлінга і братоў А. і Ф. Шлегеляў. Актуалізацыя нацыянальнай міфалогіі і фальклору (браты Я. і В. Грым, А. Афанасьеў, А. Сержпутоўскі, інш.). Сувязь міфалагічнага кірунку ў літаратуразнаўстве і параўнальнага мовазнаўства. Праца Я. Карскага «Беларусы». Міф і мова. Працы А. Лосева. Неаміфалогія. Антрапалагічная тэорыя Э. Тэйлара. «Залатая галіна» Дж. Фрэзера. Рытуальна-міфалагічная школа. Праца «Літаратура і міф» Ю. Лотмана, З. Мінц, Е. Меляцінскага. Артыкул У. Конана «Архетыпы беларускага менталітэту». Працы па сувязях беларускай класічнай літаратуры і міфалогіі У. Конана, В. Каваленкі, Т. Шамякінай.

**Тэма 3. Культурна-гістарычная школа.** Пазітывізм, уплыў прыродазнаўчых навук на гуманітарныя веды, літаратуразнаўства. Працы І. Тэна. Ідэя прычыннасці, заканамернасці. Фактары расы, асяроддзя, гістарычнага моманту ў канцэпцыі літаратурнага твора. Заходнія і ўсходнія прыхільнікі культурна-гістарычных даследаванняў. «Гісторыя нямецкай літаратуры» В. Шэрара (Scherer). Працы Г. Брандэса «Сёрэн К’еркегор», «Польскія ўражанні», «Галоўныя плыні ў еўрапейскай літаратуры XIX ст.». Працы па гісторыі антычнай і італьянскай літаратуры Ф. Дэ-Санкціса. «Гісторыя рускай інтэлігенцыі» Д. Аўсяніка-Кулікоўскага. Акадэмічныя

«Гісторыі…» беларускай літаратуры. Разуменне літаратуры як крыніцы для вывучэння рэчаіснасці. Даследаванне гісторыі літаратуры з пункту гледжання яе нацыянальнай спецыфікі ў працах В. Гачава, В. Каваленкі. Працы Д. Ліхачова па старажытнай гісторыі славянскіх літаратур. Беларуская школа культурна-гістарычнага літаратуразнаўства. Працы М. Гарэцкага, І. Замоціна, С. Александровіча, А. Адамовіча, М. Мушынскага, А. Мальдзіса, В. Чамярыцкага, А. Лойкі і інш. Біяграфічны метад у працах яго пачынальніка Ш. Сент-Бёва. Біяграфічны метад у літаратуразнаўчых працах М. Стральцова. Навуковая сутнасць тэксталагічных, крыніцазнаўчых даследаванняў. Беларускія літаратурныя энцыклапедыі.

**Тэма 4. Сацыялагічная школа**. Вывучэнне літаратуры на памежжы з сацыялогіяй. Марксісцкі варыянт сацыялагічнага літаратуразнаўства. Звужэнне культурна-гістарычнага метаду, разуменне літаратуры як формы фіксацыі сацыяльнага ў прыродзе чалавека. В. Пераверзеў, Г. Паспелаў. Вульгарны сацыялагізм 1930-х гг. у СССР і БССР. Сучасны неамарксізм і літаратуразнаўчая канцэпцыя П. Бурдзьё: поле літаратуры і яго параметры. Працы Ольдэнбургскага Інстытута славістыкі, праф. Г.-Б. Колер пра славянскія (у тым ліку беларускую) літаратуры з пункту гледжання тэорыі поля. Феміністская крытыка, гендарныя даследаванні ў літаратуразнаўстве посткаланіяльных часоў.

**Тэма 5. Вывучэнне літаратуры псіхалагічнымі метадамі**. Сувязь мовы, мыслення і псіхічных працэсаў: ад вобразаў-сімвалаў да псіхічных перажыванняў аўтара; ад псіхікі, тэмпераменту, інтэлекту мастака – да раскрыцця сімволікі вобразаў. Паняцце пра «творчую лабараторыю» пісьменніка. Харкаўская псіхалагічная школа 1930-х гг. Праца Л.С. Выгоцкага «Псіхалогія мастацтва». Псіхалагізм у літаратуры як паказ сінхроннай множнасці імпульсаў з розных сфер свядомасці і падсвядомасці асобы. Манаграфічныя працы беларускіх літаратуразнаўцаў, прысвечаныя даследаванню псіхалагізму і псіхалагічнага аналізу ў літаратуры (А. Адамовіч пра імпрэсіяністычную прозу К. Чорнага, інш.). Фрэйд і фрэйдызм ва ўсходнеславянскім культурным кантэксце. Працы З. Фрэйда «Вытлумачэнне снабачанняў», «Татэм і табу». К. Юнг і тэорыя архетыпу як першаўзору з чалавечай псіхікі, у якім захоўваецца вопыт калектыўнага бессвядомага. Фрэйдызм у працах філосафаў-структуралістаў і мастакоў-постмадэрністаў: у канцэпцыях М. Фуко (акцэнты на цялеснасці, саматыцы), Р. Барта (эрас тэксту), трансфармацыя псіхааналізу ў шызааналіз у працах Дэлёза, Гватары, інш. Постфрэйдызм у кнізе Ю. Барысевіча «Цела і тэкст».

**Тэма 6. Параўнальна-гістарычная школа.** Т. Бенфей і яго тэорыя запазычанняў, вандроўных сюжэтаў. Параўнальна-гістарычная школа ў Расіі. “Гістарычная паэтыка” А.М. Весялоўскага. Паняцце матыву паводле Весялоўскага. Працы В.М. Жырмунскага: размежаванне, з аднаго боку,

гісторыка-генетычных сыходжанняў і разыходжанняў паміж літаратурнымі з’явамі; з другога – вызначэнне гісторыка-тыпалагічнага падабенства паміж з’явамі, не звязанымі генетычна, але падобнымі дзякуючы аналагічным умовам развіцця. Працы В. Жырмунскага «Байран і Пушкін», «Гётэ і руская літаратура», М. Конрада «Захад і Усход». Здабыткі і страты параўнальнага літаратуразнаўства ў СССР. Манаграфія М. Тычыны «Аляксандр Пушкін і Якуб Колас». Тыпалагічны падыход да аналізу беларускай літаратуры ў кантэксце сусветнай у працах І. Шаблоўскай. Вывучэнне рознаўзроўневых літаратурных узаемасувязяў у працах беларускіх кампаратывістаў (у манаграфічных і серыйных выданнях). Тэорыя мастацкага перакладу.

**Тэма 7. Фармальная школа.** Ідэі заснавальніка структурнай лінгвістыкі Ф. дэ Сасюра, які размежаваў мову (langue) и маўленне (parole); г.зн. сацыяльнае і індывідуальнае ў мове. Уплыў філасофіі і эстэтыкі мадэрнізму на літаратуразнаўства. Іманентны аналіз мастацкага твора. Тэорыя Г. Вёльфліна пра ўспрыняцце самых розных мастацкіх форм праз інтуітыўнае вычуванне, «психологию вчувствования». Нямецкі фармалізм (О. Вальцаль, інш.). Інтуітывізм А. Бергсона. Эстэтыка Б. Крочэ. «Новая крытыка» як найбольш уплывовая школа ў англа-амерыканскім літаратуразнаўстве XX ст.: з акцэнтам на скрупулёзным вывучэнні ўнутранай структуры твора, прызнанні яго аўтаномнасці і самадастатковасці. ОПОЯЗ у Расіі. «Мастацтва як прыём» В. Шклоўскага, «Як зроблены “Шынель” Гогаля» Б. Эйхенбаўма, «Аб мове мастацкай прозы» В. Вінаградава. Працы па вершазнаўству Ю. Тынянава, В. Жырмунскага, М. Гаспарава. Вывучэнне структуры мастацкага тэксту і яго рытмічнай арганізацыі ў працах беларускіх даследчыкаў (В. Жураўлёва, В. Рагойшы, А. Яскевіча, І. Жука, інш.) Метад сінхроннага структурнага аналізу казкі як выток тэорыі нарацыі ў працы «Марфалогія казкі» В. Пропа.

**Тэма 8. Герменеўтыка ў філасофіі і філалогіі**. Роля Ф. Шлейермахера і В. Дзільтэя ў развіцці герменеўтычных літаратуразнаўчых даследаванняў. Праблемы ўспрыняцця, разумення, інтэрпрэтацыі ў працах М. Хайдэгера, Х. Гадамера, П. Рыкёра. Праца Г. Шпета «Герменеўтыка і яе праблемы». Беларускае скарыназнаўства і біблеістыка. «Філасофскае літаратуразнаўства» М. Бахціна. Разуменне быцця як падзеі, якая не мысліцца без учынку і суб’екта (чалавека). Тыпы слова паводле Бахціна. Маналог і дыялог. Канцэпцыя поліфанізму ў літаратурным творы. Бахцінскія паняцці хранатопу, смехавой культуры, карнавалізацыі; арыгінальная бахцінская тэорыя еўрапейскага рамана, меніпеі. Уплыў ідэй Бахціна на літаратуразнаўства XX ст.

**Тэма 9. Семіятычная школа.** Уплыў структурнай лінгвістыкі, філасофіі структуралізму, постструктуралізму на літаратуразнаўства. Структуралізм і постмадэрнізм. Успрыняцце свету як тэксту, ідэя

інтэртэкстуальнасці. Семіётыка як навука пра знакі і знакавыя сістэмы (арганічныя і штучныя мовы), трансляцыю сэнсаў і камунікацыю. Вытокі семіётыкі ў працах Пражскай школы 1920-х гг. Ідэі Р. Якабсона, Я. Мукаржоўскага. Французскі структуралізм сярэдзіны XX ст.: Ц. Тодараў, Ю. Крысцева. Праца Р. Барта «Смерць аўтара». Спадчына Ю. Лотмана – заснавальніка Тартуска-маскоўскай семіятычнай школы. Працы Ю.М. Лотмана «Структура мастацкага тэксту», «Культура і выбух». Артыкул Ю.М. Лотмана «Масавая літаратура як гісторыка-культурная праблема». Праца В. Шміда «Нараталогія». Паняцце дыскурсу (ад лац. "discursus" - разважанне) як тэксту (сістэмы ўзаемазвязаных сімвалаў), актуалізаванага ў пэўнай сацыякультурнай (камунікатыўнай) сітуацыі. Дыскурс-аналіз па З. Харысу: ідэя пра «рух інфармацыі ў дыскурсе» і «алгарытм Харыса», які дае магчымасць вызначаць ступень інфарматыўнасці знака ў тэксце. Скіраванасць дыскурс-аналізу на выяўленне сацыякультурных (ідэалагічных, палітычный, рэлігійных, інш.) перадумоў у арганізацыі самых розных форм маўленчай дзейнасці.

**Тэма 10. Стварэнне навучэнцамі індывідуальных версій выкарыстання пэўнай метадалогіі.** Распрацоўка індывідуальнага алгарытму выкарыстання метадаў з арсеналу той ці іншай школы, з якой навучэнец магістратуры суадносіць сваю навуковую працу; дэманстрацыя эфектыўнасці выбранай метадалогіі.

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | Лабараторныя Заняткі | Іншае | | |
| 1 | Праблемы літаратуразнаўчай метадалогіі ў сучаснай навуцы | 2 | | | | | | Міні-эсэ |
| 2 | Міфалагічная школа | 2 | | 2 | | | | Вуснае апытанне |
| 3. | Культурна-гістарычная школа | 2 | | 2 | | | 2 | Пісьмовае апытанне |
| 4. | Сацыялагічная школа | 2 | | | | | | |
| 5. | Вывучэнне літаратуры псіхалагічнымі метадамі | 2 | | | | | 2 | Тэсты |
| 6. | Параўнальна-гістарычная школа | 2 | | 2 | | | 2 | Пісьмовае апытанне |
| 7. | Фармальная школа | 2 | | | | | | Франтальнае апытанне |
| 8. | Германеўтыка ў філасофіі і філалогіі | 2 | | | | | | Вуснае апытанне |
| 9. | Семіятычная школа | 2 | | 2 | | | | Тэсты |
| 10. | Стварэнне навучэнцамі індывідуальных версій выкарыстання пэўнай метадалогіі | | 2 | | | | | Вуснае апытанне |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-ДАВЕДАЧНАЯ ЧАСТКА

***Асноўная літаратура:***

1. Аверинцев С.С., Андреев А.А., Гаспаров М.Л., Гринцер П.А., Михайлов А.В. Категории поэтики в смене литературных эпох // Историческая поэтика: Литературные эпохи и типы художественного сознания. – М.: Наука, 1994.

2. Андреев, А.Н. Методология литературоведения. – Минск, «Электронная книга БГУ», 2003.

3. Баршчэўскі Л.П., Васючэнка П.В., Тычына М.А. Беларуская літаратура і свет: ад эпохі рамантызму да нашых дзён. – Мінск: Радыёла-плюс, 2006. – 596 с.

4. Бахтин, М.М. К методологии гуманитарных наук // Эстетика словесного творчества / М. М. Бахтин; [примеч. С.С. Аверинцева, С.Г. Бочарова]. – М.: Искусство, 1986. – С. 381 – 393. (444 с.)

5. Бушмин, А. С. Методологические вопросы литературоведческих исследований / А. С. Бушмин; Ин-т рус. литературы АН СССР. – Л.: Наука, Ленингр. отд-ние, 1969. – 228 с.

6. Гарадніцкі, Я.А. Беларускае літаратуразнаўства: канцэпцыі, метады, напрамкі / Я.А. Гарадніцкі. – Мінск: Беларус. дзярж. педун-т, 2006.

7. Гарадніцкі, Я.А. Літаратура як мастацтва: камунікатыўнасць, інтэрмедыяльнасць, наратыўнасць / А.Я.Гарадніцкі. – Мінск: Бел. навука, 2014. – 401 с.

8. Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стгоддзя. У 4 т. (Т.т.: 1; 2; 3; 4 у 3-х кн.) / Нац. Акад. навук Беларусі, Ін-т літаратуры імя Я.Купалы [НАН Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Цэнтр даслед. Беларус. культуры, мовы і літ. – Мінск: Беларуская навука, 1998 – 2014.

9. Есин, А. Б. Принципы и приемы анализа литературного произведения: учеб. пособие для студ. и преподавателей филолог. фак., учителей-словесников / А. Б. Есин. – М.: Флинта; Наука, 1998. – 248 с.

10. Литературная энциклопедия терминов и понятий / [под ред. А. Н. Николюкина; Рос. акад. наук, Ин-т науч. информ. по общ. наукам]. – М.: НПК «Интелвак», 2001. – 1600 с.

11. Максім Багдановіч: Энцыклапедыя / склад. І.У. Саламевіч, М.В. Трус; навук. рэд. М.В. Трус; рэдкал.: Т.У. Бялова (гал. рэд.) і інш. – Мінск: Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. – 608 с.

12. Рагойша, В. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах / В. Рагойша. – Мінск: «Беларуская энцыклапедыя», 2001. – 384 с.

13. Современное зарубежное литературоведение (страны Западной Европы и США): Концепции, школы, термины: Энциклопедический справочник / [под ред. И. П. Ильина; Рос. акад. наук, Ин-т науч. информ. общ. наук]. – М.: Интрада, 1996. – 319 с.

14. Тюпа, В.И. Анализ художественного текста: учеб. пособие для студ. филол. фак. высш. учеб. заведений / В.И.Тюпа. – 3-е изд., стер. – М.: Издательский центр «Академия», 2009. – 336 с.

15. Янка Купала: Энцыклапедычны даведнік / БелСЭ; рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелСЭ, 1986. – 727 с.

***Дадатковая літаратура:***

1. Абдзіраловіч, І. Адвечным шляхам: Дасьледзіны беларускага сьветагляду / І.Абдзіраловіч [Прадмова С.Дубаўца]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993 . – 44 с. (Згукі мінуўшчыны).
2. Адамовіч, А. "Браму скарбаў сваіх адчыняю…": Даследаванне жыцця і творчасці М.Гарэцкага / А.Адамовіч. – Минск: Выд-ва БДУ, 1980. – 223 с.
3. Адамовіч, А. Здалёк і зблізку (Беларуская проза на літаратурнай планеце): Зб. літ.-крытыч. артыкулаў/ А.Адамовіч. – Мінск: Маст. літ., 1976. – 623с.
4. Академические школы в русском литературоведении; отв. ред. П.Н. Николаев. – М. , 1975.
5. Андреев А.Н. Целостный анализ литературного произведения: Учеб. пособие для студентов вузов / А.Н.Андреев. – Минск: Изд. центр БГУ, 1995.
6. Бабарэка, А. Збор твораў: У 2 т. / А.Бабарэка [Уклад. А.А. Бабарэка, В.В. Жыбуль, Г.В.Запартыка]. – Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2011. – Т.1 – 939 с.; Т.2 – 726 с.
7. Багдановіч, І.Э. Авангард і традыцыя: Бел. паэзія на хвалі нац. адраджэння. – Мн.: Бел. навука, 2001.
8. Барт, Р. Избранные работы: Семиотика. Поэтика / пер с. франц., сост., общ. ред. и вступит. ст. Г. К. Косикова. – М.: Прогресс, 1989. – 615 с.
9. Барысевіч Ю. Цела і тэкст [Тэкст] / Ю. Барысевіч. – Мн. : БГАКЦ, 1998. – 162 с.
10. Бахтин, М. М. Вопросы литературы и эстетики: Исследования разных лет / М. М. Бахтин. – М.: Худож. литература, 1975. – 502 с.
11. Бахтин, М. М. Проблемы поэтики Достоевского / М.М. Бахтин. – М., 1963; 1974; 1979 (4-е изд.); Киев, 1994 (5-е изд.).
12. Бахтин, М. М. Творчество Франсуа Рабле и народная культура средневековья и Ренессанса / М.М. Бахтин. — М., 1965; 1990.
13. Бароўка В.Ю. Мастацкае народазнаўства ў беларускай літаратуры ХХ стагоддзя (на матэрыяле прозы): манаграфія / В.Ю. Бароўка. – Віцебск: УА "ВДУ імя П.М.Машэрава, 2009. – 211 с.
14. Брэтон, Ф., Пру, С. «Выбух камунікацый»: нараджэнне новай ідэалогіі / Ф. Брэтон, С. Пру. – Мінск: Беларускі Фонд Сораса, 1995. – 336 с.
15. Бугаёў Д. Праўда і мужнасць таленту: Выбранае / Д. Бугаёў [Прадм. І. Чыгрынава]. – Мінск: Маст. літ., 1995. – 414 с.
16. Бугаёў, Дз. Спавядальнае слова: Літаратурная крытыка, успаміны / Дз. Бугаёў. – Мінск: Маст. літ., 2001. – 327 с.
17. Веселовский, А. Н. Историческая поэтика / А. Н. Веселовский; [вступ. ст. П. К. Горского; коммент. В. В. Мочаловой ]. – М.: Высш. шк., 1989. – 404 с. – (Классика литературной науки).

18. Виноградов, В. В. Проблемы содержания и формы литературного произведения / В. В. Виноградов. – М.: Изд-во МГУ, 1958. – 216 с.
19. Виноградов, В. В. Стилистика. Теория поэтической речи. Поэтика / В.В. Виноградов; АН СССР, Отд. лит. и яз. – М.: Изд-во АН СССР, 1963. – 255 с.
20. Волков, И. Ф. Творческие методы и художественные системы. – 2-е изд., доп. / И. Ф. Волков. – М.: Искусство, 1989. – 253 с.
21. Вундт, В. Проблемы психологии народов / В. Вундт. – СПб.: Интер, 2001. – 160 с.
22. Гадамер, Х.-Г. Хайдеггер и греки / Х.-Г. Гадамер [Перевод и примечания М. Ф. Быковой] // Логос. — 1991. — № 2. — С. 56—68.
23. Гаспаров, М. Л. Избранные статьи / М. Л. Гаспаров. – М.: Новое литературное обозрение, 1995. – 477 с. – (Новое лит. обозр., Научн. прилож. Вып. II).
24. Гачев, Г.Д. Национальные образы мира : общие вопр. Русский. Болгарский. Киргизский. Грузинский. Армянский / Г.Д. Гачев. – М. , 1988.
25. Гачев, Г.Д. Национальные образы мира. Соседи России: Польша, Литва, Эстония / Г.Д. Гачев. – М.: Прогресс-Традиция, 2003.
26. Гачев, Г.Д. Содержательность художественых форм. Эпос. Лирика. Театр / Г.Д. Гачев. – М.: Просвещение, 1968. – 303 с.
27. Гинзбург, Л. О психологической прозе / Л. Гинзбург. – Л.: Худож. лит., Ленингр.отд-ние. 1977. – 443 с.
28. Гиршман, М. М. Литературное произведение: Теория и практика анализа / М. М. Гиршман. – М.: Высш. шк., 1991. – 159 с. – (Б-ка преподавателя).
29. Голосовкер, Я.Э. Логика мифа / Я.Э. Голосовкер. – М.: Наука, 1987. – 217 с.
30. Гуманітарныя і сацыяльныя навукі на зыходзе ХХ стагоддзя / НАН Беларусі; навук. рэд. Л.Ф. Яўменаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1998.
31. Гумилев, Л.Н. Конец и вновь начало / Л.Н.Гумилев [Сост. Н.В.Гумилева; предисл., коммент., общ. ред., карт. А.И.Куркчи]. – М.: Библ. информ. об-ние «Танаис»: ДИ-ДИК, 1994. – (Б-ка «Мир Л.Н.Гумилева». Сер. 1. Сочинения; Вып. 2).
32. Даніленка, С.І. Спецыфіка сацыяльнай міфалагізацыі ў савецкай і постсавецкай літаратуры ў кантэксце яе інфернальнай вобразнасці / С.І. Даніленка. – Магілёў: Бел.-Рас. ун-т, 2006.
33. Дима, А. Принципы сравнительного литературоведения ; пер. с рум. / А. Дима. – М. , 1977.
34. Дугин, А. Поп-культура и знаки времени / А.Дугин. – СПб.: Амфора, 2005. – 495 с.
35. Дюришин, Д. Теория сравнительного литературоведения ; пер. со словац. / Д. Дюришин. – М. ,1979.
36. Жирмунский, В.М. Сравнительное литературоведение : Восток и Запад / В.М. Жирмунский. – Л. , 1979.

37. Жирмунский, В. М. Теория стиха / В. Жирмунский; [послесл. В. Е. Холшевникова]. – Л.: Сов. писатель, Ленингр. отд-ние, 1975. – 664 с.
38. Жук, І.В. Празаічны тэкст: дынаміка рытмавага існавання: Манагр. / І.В.Жук; пад рэд. А.А.Лойкі. – Гродна: ГрДУ, 2003. – 234 с.
39. Жураўлёў, В.П. Структура твора: Рух сюжэтна-кампазіцыйных форм / В.П. Жураўлёў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1978. – 311 с.
40. Жураўлёў, В.П., Тычына, М.А. Магчымасці рэалізму: Прычыннасць і гістарызм / В.П.Жураўлёў, М.А.Тычына; рэд. П.К. Дзюбайла. – Мінск: Навука і тэхніка, 1982. – 232 с.
41. Зарубежная эстетика и теория литературы XIX–XX вв.: трактаты, статьи, эссе. – М. , 1987.
42. Затонский, Д.Н. Европейский реализм XIX века: линии и лики / Д.Н. Затонский. – Киев: Науч. думка, 1984. – 279 с.
43. Ідэйна-тэарэтычныя пытанні сучаснага літаратурнага працэсу. – Мінск: Навука і тэхніка, 1987.
44. Ильин, И.П. Постструктурализм. Деконструктивизм. Постмодернизм / И.П. Ильин. - М., 1996.
45. Ионин, Л.Г. Социология культуры / Л.Г. Ионин. – М.: Логос, 1998. – 280 с.
46. Историческая поэтика: Итоги и перспективы изучения / [Ред. колл.: М.Б. Храпченко и др.]. – М.: Наука, 1986. – 336 с.
47. Каваленка, В.А. Вытокі. Уплывы. Паскоранасць. Развіццё беларускай літаратуры XIX – XX стагоддзяў / В.А.Каваленка [Рэд. П.К.Дзюбайла]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1975. – 336 с.
48. Каваленка, В.А. Міфа-паэтычныя матывы ў беларускай літаратуры / В.А. Каваленка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1981. – 320 с.
49. Калеснік, У. Тварэнне легенды: Літ.партрэты і нарысы / У.Калеснік. – Мінск: Маст. літ., 1987. – 431 с.
50. Козлов, А.С. Мифологическое направление в литературоведении США / Козлов А.С.. - М., 1988.
51. Конан, У. Архетыпы беларускага менталітэту: спроба рэканструкцыі паводле нацыянальнай міфалогіі і казачнага эпасу // Беларусіка – Albaruthenica; Кн. 2 / Рэд. А.Анціпенка і інш. – Мінск: Нацыянальны навукова-асветны цэнтр імя Ф.Скарыны, 1992. – С. 18 – 28.
52. Конан, У. Выбранае / У.Конан. – Мінск: Смэлтак, 2009.
53. Конан, У. Ля вытокаў самапазнання: Станаўленне духоўных каштоўнасцей у святле фальклору/ У. Конан. – Мінск: Маст. літ., 1989. – 238 с.
54. Конрад, Н.И. Запад и Восток / Н.И. Конрад. – М. , 1972.
55. Корань (Сінькова), Л.Д. Беларуская проза XX стагоддзя: Дынаміка жанравых структур / Л.Д. Корань (Сінькова). – Мінск: ВПП “Новік”, 1996. – 220 с.
56. Крукоўскі, М. Філасофія культуры: Уводзіны ў тэарэтычную культуралогію / М. Крукоўскі. – Мінск, 2000.

57. Курилов, В.В. Теория и методология в науке о литературе / В.В. Курилов. – Ростов на Дону: Ростов. гос. ун-т, 1985.
58. Літаратура пераходнага перыяду: тэарэтычныя асновы гісторыка-літаратурнага працэсу / М.А. Тычына [і інш.]; навук. рэд. М.А. Тычына. – Мінск: Беларус. навука, 2007. – 363 с.
59. Лихачёв, Д. Литература-реальность-литература: Статьи / Д. Лихачёв – Ленинград: Сов. Писатель, 1984. – 272 с.
60. Лихачев, Д.С. Прошлое – будущему: Статьи и очерки / Д.С. Лихачев. – Л.: Наука, Ленингр. отд-ние,1985. (Наука. Мировоззрение. Жизнь.).
61. Лойка, А.А. Роўнакутны трохвугольнік, або Ад Палямона да Максіма Танка. Дапаможнік па спецкурсе "Беларуска – руска – польскія літаратурныя сувязі" / А.А.Лойка. – Мн., 2003. – 214 с.
62. Лойка А.А. Дрэва жыцця: Кніга аднаго лёсу / А.А.Лойка. – Слонім: ГАУПП "Слонім. друк." , 2004. – С. 169. (624 с.).
63. Лосев, А.Ф. В поисках смысла (Из бесед и воспоминаний) // Лосев А.Ф. Страсть к диалектике: Лит. размышления философа / А.Ф. Лосев. – М.: Сов. писатель, 1990. – 318 с.
64. Лотман, Ю.М. Культура и взрыв / Ю.М. Лотман. – М.: Прогресс, Гнозис, 1992. – 270 с.
65. Лотман, Ю.М. Механизмы культуры // Лотман Ю.М. Избранные статьи: В 3 т. Т. 3/ Ю.М.Лотман. – Таллин: Александра, 1993. – С. 380 – 388.
66. Лотман, Ю.М. О поэтах и поэзии: Анализ поэтического текста. Статьи и исследования. Заметки. Рецензии. Выступления / Ю.М. Лотман; вступ. ст. М. Л. Гаспарова. – СПб.: Искусство-СПб., 1996. – 846 с.
67. Лотман, Ю.М. Роман А. С. Пушкина «Евгений Онегин»: комментарий. 2-е изд. / Ю.М.Лотман. – М., 1983.
68. Лотман, Ю.М. Структура художественного текста / Ю.М. Лотман. – М.: Искусство, 1970. – 384 с. – (Семиотические исследования по теории искусства).
69. Лявонава, Е.А. Беларуская літаратура XX ст. і еўрапейскі літаратурны вопыт / Е.А. Лявонава. – Мінск: БДУ, 2002. – 128 с.
70. Лявонава, Е.А Плыні і постаці: З гісторыі сусвет. літ. другой паловы XIX – XX стст.: Дапам. для настаўнікаў / Е.А. Лявонава. – Мінск: Рэд. часоп. "Крыніца", 1998. – 336 с.
71. Макмілін, А. Беларуская літаратура дыяспары / Пер. з англ. – Мн.: УП "Тэхнапрынт", 2004.
72. Матыўная прастора беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя: манагр. / І.В. Жук [і інш.]; пад агул. рэд. І.В. Жука. – Гродна : ГрДУ, 2009. – 255 с.
73. Мелетинский, Е.М. Введение в историческую поэтику эпоса и романа / Е.М. Мелетинский. – М.: Наука, 1986. – 318 с.
74. Мельнікава, З.П. Беларускае гісторыка-функцыянальнае літаратуразнаўства / З.П. Мельнікава. – Брэст: Брэсц. дзярж. ун-т, 2003.

75. Міждысцыплінарныя даследаванні актуальных праблем тэорыі літаратуры / М.А. Тычына [і інш.]; навук. рэд. М.А. Тычына. – Мінск: Беларус. навука, 2011. – 396 с.
76. Мукаржовский, Я. О структурализме // Мукаржовский Я. Исследования по эстетике и теории искусства / [Сост., коммент. Ю.М. Лотмана и О.М. Малевича; вступ. ст. Ю.М. Лотмана; пер. с чеш. В.А. Каменской]. – М.: Искусство, 1994. – С. 275 – 290.
77. Мушынскі, М.І. І нічога, апроч праўды: Якой быць «Гісторыі беларускай літаратуры» / М.І. Мушынскі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1990. – 127 с.
78. Навуменка, І. Слова пра Коласа // Навуменка І. Збор твораў: У 6 т. Т. 6.– Мінск: Маст. літ., 1984. – С. 374 – 531.
79. Нарысы па гісторыі беларуска-рускіх літаратурных сувязей: У 4 кн. Кн. 3: 1917 – 1941 гг. Мн., 1994.
80. Николаев, П.А. Типология и компаративистика. Современная жизнь понятий / П.А. Николаев // Филол. науки. – 1996. – № 3 . – С. 12.
81. Оболенская, Ю.Л. Художественный перевод и межкультурная коммуникация / Ю.Л. Оболенская. – М. , 2006.
82. Погляды на спецыфічнасць “малых” літаратур: беларуская і ўкраінская літаратуры / уклад. Гун-Брыт Колер, Павел Навуменка. – Мінск : Паркус-плюс, 2012. – 350 с.
83. Поляков, М.Я. Историческая поэтика и теория жанров // Поляков М.Я. Вопросы поэтики и художественной семантики / М.Я.Поляков. -2-е изд., доп. – М.: Сов. писатель, 1986. – С. 299 – 325.
84. Поспелов, Г.Н. Вопросы методологии и поэтики / Г.Н. Поспелов: Наука, 1983.
85. Поспелов, Г.Н. Стадиальное развитие европейских литератур / Г.Н. Поспелов. – М. , 1988.
86. Потебня, А. А. Теоретическая поэтика: / А. А. Потебня; [сост., авт. вступ. ст., коммент. А. Б. Муратов]. – М.: Высш. шк., 1990. – 342 с. – (Классика литературной науки).
87. Постмодернизм. Энциклопедия / сост. А. А. Грицанов, М. А. Можейко. – Мн.: Интерпрессервис; Книжный Дом, 2001.
88. Пропп В.Я. Морфология волшебной сказки . – М.: Лабиринт,1998. –512 с.
89. Ритм, пространство и время в литературе и искусстве: Сб. статей / Ред. колегия : Б.Ф. Егоров (отв. ред.) и др. – Л.: Наука, Ленингр. отд-ние, 1974.
90. Семиотика: Антология / Сост. Ю. С. Степанов; Изд. 2-е, испр. и доп. – М.: Академический Проект; Екатеринбург: Деловая книга, 2001. – 702 с.
91. Синило, Г.В. Экклесиаст и его рецепция в мировой культуре. В 2-х ч. Ч.2: Экклесиаст в мировой поэзии: от Поздней Античности до Раннего Нового времени / Г.В.Синило, - Минск: БГУ, 2013. – 543 с.
92. Синило, Г.В. Экклесиаст и его рецепция в мировой культуре. В 2-х ч. Ч.1: Предтечи, поэтика, религиозные интерпретации / Г.В.Синило. – Минск: БГУ, 2012. – 220 с.

93. Сінькова, Л.Д. Паміж тэкстам і дыскурсам: Беларуская літаратура XX – XXI стст. : гісторыя, кампаратывістыка і крытыка / Л. Д. Сінькова. – Мінск : Паркус плюс, 2013. – 296 с.
94. Сінькова, Л. Карэляцыя як метад у параўнальным вывучэнні літаратур / Л. Сінькова // Acta Albaruthenica. Tom 14 [red. naukowa Mikołaj Timoszuk, Mikołaj Chaustowicz]. – Warszawa: Katedra Białorutenistyki Uniwersytetu Warszawskiego, 2014. – С. 347 – 356.
95. Сравнительное литературоведение : Россия и Запад : XIX век : учеб пособие ; под ред. В.Б. Катаева, Л.В. Чернец. – М. , 2008.
96. Степанов, Ю. С. Семиотика // Лингвистический энциклопедический словарь. – М.: СЭ, 1990. – С. 440 – 442.
97. Стральцова, В.М. Шлях да сябе: Сучас. аўтабіягр. проза як маст. сістэма / В.М. Стральцова. – Мінск: Бел. навука, 2002. – 112 с.
98. Тарасюк, Л.К. Мастацкія кірункі і плыні ў беларускай паэзіі XIX – пачатку XX ст.: Вучэб. дапам. для студэнтаў філал. фак. / Л.К.Тарасюк. – Минск: БДУ, 1999. – 72 с.
99. Теория литературы: учеб. пособие для студ. филол. фак. высш. учеб. заведений : В 2 т. / Под ред. Н. Д. Тамарченко. – М.: Изд. центр «Академия», 2004.
100. Тиме, Г.А. О некоторых тенденциях в современной компаративистике / Г.А. Тиме // Россия. Запад. Восток. Встречные движения. – СПб. , 1996. – 389 с.
101. Тлостанова, М.В. Постсоветская литература и эстетика транскультурации. Жить никогда, писать ниоткуда / М.В. Тлостанова. – М.: Едиториал УРСС, 2004. – 416 с.
102. Томашевский, Б.В. Теория литературы. Поэтика / Б.В. Томашевский – М.: Аспект-Пресс, 1999. – 334 с.
103. Топоров, В.Н. Миф. Ритуал. Символ. Образ. Исследования в области мифопоэтического / В.Н.Топоров. – М., 1995.
104. Тынянов, Ю.Н. Литературная эволюция: Избранные труды / Ю.Н. Тынянов.– Москва: Аграф, 2002. – 496 с.
105. Тычко, Г.К. Творчасць Янкі Купалы і традыцыя духоўнай рэгіянальнасці ў польскай літаратуры XIX – пачатку XX стагоддзяў/ Пад рэд. А.А.Лойкі. – Мн.: УП «Тэхнапрынт», 2001. – 144 с.
106. Тычына, М.А. Аляксандр Пушкін і Якуб Колас / М.А. Тычына. – Мінск, 1999. – 168 с.
107. Тюпа, В. И. Художественный дискурс: Введение в теорию литературы / В. И. Тюпа. – Тверь: Изд-во ТвГУ, 2002. – 80 с.
108. Успенский, Б.А. Поэтика композиции: Структура художественного текста и типология композиционной формы / Б.А. Успенский. – Москва: Искусство, 1970 – 224 с.
109. Хализев, В.Е. Теория литературы: учебник / В.Е. Хализев. – 2-е изд. – М.: Высш. шк., 2000.

110. Ханзен-Лёве, О.А. Русский формализм: Методологическая реконструкция развития на основе принципа остранения / О.А.Ханзен-Лёве. – М., 2001.
111. Шаблоўская, І.В. Сусветная літаратура ў беларускай прасторы / І.В. Шаблоўская. – Мінск: БДУ, 2007.
112. Шайтанов, И.О. Компаративистика и / или поэтика: английские сюжеты глазами исторической поэтики / И .О. Шайтанов. – М., 2010. – 656 с.
113. Шамякіна, Т.І. Беларуская класічная літаратура і міфалогія / Т.І. Шамякіна. – Мінск: Выд-ва Беларус. дзярж. ун-та, 2001. – 186 с.
114. Шкловский, В. Б. О теории прозы / В. Б. Шкловский. – Москва: Советский писатель, 1983. – 384 с.
115. Шкловский, В.Б. Тетива: О несходстве сходного. / В.Б. Шкловский. – Москва: Советский писатель, 1970. – 376 с.
116. Шлях па прамой часу. Да гісторыі беларускай літаратуры Польшчы: 1958 – 2008 гг. / Пад рэд. Я.Чыквіна. – Беласток, "БЕЛАВЕЖА", 2007. – 322 с.
117. Шмид В. Нарратология / В. Шмид. – М.: Языки славянской культуры, 2003.
118. Эйхенбаум, Б. Как сделана "Шинель" Гогаля // О прозе: Сборник статей / Б. Эйхенбаум. – Ленинград: Художественная литература, 1969. – 504 с.
119. Эпштейн, М.Н. Пародоксы новизны: о лит.развитии XIX-XX вв. / М.Н. Эпштейн. – М.: Сов. писатель, 1988. – 419 с.
120. Яскевіч, А.С. Рытмічная арганізацыя мастацкага тэксту / А.С.Яскевіч. Мінск, 1991.
121. McMillin, Arnold. Belarusian literature of the diaspora / Arnold McMillin. – Birmingham, 2002.
122. Sinkowa-Koran, L., Tyczko, H. Postsowiecka literatura białoruska w europejskim dialogu międzynarodowym (Z języka białoruskiego przeł. Justyna Dudar) // Literatury słowiańskie po roku 1989: nowe zjawiska, tendencje, perspektywy. Tom 1. Transformacja / pod redakcją Haliny Janaszek-Ivaničkovej. Warszawa: Dom wydawniczy ELIPSA, 2005. S. 171 – 180 (304 S.).

# ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ З ІНШЫМІ ДЫСЦЫПЛІНАМІ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

| Назва дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумара пратакола) |
|---|---|---|---|
| Тэорыя літаратуры | Тэорыі літаратуры | Няма | Пратакол № 9 ад 21.05.2015 г. |
| Беларуская літаратура | Гісторыі беларускай літаратуры, беларускай літаратуры і культуры | Няма | Пратакол № 9 ад 21.05.2015 г. |
| Замежная літаратура | Замежнай літаратуры | Няма | Пратакол № 9 ад 21.05.2015 г. |
| Руская літаратура | Рускай літаратуры | Няма | Пратакол № 9 ад 21.05.2015 г. |

# ЗМЕНЫ І ДАПАЎНЕННІ ДА ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ НА ________/________ВУЧЭБНЫ ГОД

| №№ п/п | Змены і дапаўненні | Падстава |
|---|---|---|
| | | |

Вучэбная праграма перагледжана і адобрана на пасяджэнні кафедры
(пратакол №___________ ад__________________ 20__ г.)

Загадчык кафедры

_______________________ _______________________ _______________________
(ступень, званне) (подпіс) (ініцыялы, прозвішча)

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дэкан факультэта

_______________________ _______________________ _______________________
(ступень, званне) (подпіс) (ініцыялы, прозвішча)